Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 14. Варыянт 2**

**Білет 14. Практычнае заданне. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.**

**Заданне склала:**настаўнік-метадыст Матрусава А.М., ДУА «Сярэдняя школа №31 г. Віцебска імя В.З. Харужай»

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Сфармулюйце вызначэнне паняцця "генацыд".
2. Што ўяўляў сабой "новы парадак", які гітлераўскае камандаванне ўстанаўлівала на акупаваных тэрыторыях?
3. Чаму дзеянні, учыненыя нацысцкімі злачынцамі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца генацыдам беларускага народа? Канкрэтызуйце свой адказ прыкладамі з крыніц.
4. Дакажыце, што «новы парадак» германскіх акупантаў меў чалавеканенавісніцкі характар.

**Крыніца 1**

**З запіскі сакратара ЦК КП(б)Б, члена Ваеннай рады Заходняга фронту П. К. Панамарэнка І. В. Сталіну. 19 ліпеня 1941 г.**

На занятай тэрыторыі Беларусі немцы пачынаюць арганізавана рабаваць хлеб, быдла і т. д. Гарасін забіраюць ці ледзь не з лямпаў. Усё шырэй становяцца
зверскія расправы з насельніцтвам...
У Слуцку і некаторых іншых месцах ужо арганізаваны канцэнтрацыйныя лагеры. За дрот заганяюць усіх працаздольных, кормяць поліўкай з каніны 1 раз у 2 дні, рыхтуюць для ўборкі ўраджаю, дарожных і іншых прац. За найменшую праяву незадаволенасці або адмову ад выдачы камуністаў або партызан, не кажучы ўжо пра выступы сялян супраць немцаў, вёскі спальваюцца дашчэнту.
Па лініі Брэста ўжо працуюць філіялы гестапа, рыхтуюць спісы для шырокіх арыштаў. Астатнія сем'і актывістаў і работнікаў расстрэльваюць проста на вуліцах.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Крыніца 2 Найбуйнейшыя канцэнтрацыйныя лагеры і месцы масавага знішчэння савецкіх грамадзян на тэрыторыі Беларусі**




**Крыніца 3**

**Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (прынята Генеральнай Асамблеяй ААН 9 снежня 1948 года)**

Артыкул I. Дагаворныя бакі пацвярджаюць, што генацыд незалежна ад таго, ці здзяйсняецца ён у мірны ці ваенны час, з'яўляецца злачынствам, якое парушае нормы міжнароднага права і супраць.

якога яны абавязваюцца прымаць меры папярэджання і караць за яго здзяйсненне…

Артыкул 127. Генацыд: дзеянні, якія здзяйсняюцца з мэтай планамернага знішчэння поўнасцю або часткова якой-небудзь расавай, нацыянальнай, этнічнай, рэлігійнай групы або групы, вызначанай на аснове любога іншага адвольнага крытэрыю, шляхам забойства членаў такой групы або прычынення ім цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або наўмыснага стварэння жыццёвых умоў, разлічаных на поўнае або частковае фізічнае знішчэнне такой групы, або гвалтоўнай перадачы дзяцей з адной этнічнай групы ў іншую, або прыняцця мер па перашкодзе дзіцянараджэння ў асяроддзі такой групы…